ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

СЕСІЯ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 2 (1000) ● ЧАЦВЕР, 18 студзеня 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII

ЛАЎРЭАТЫ

У дні, калі савецкі народ і ўсё прагрэсіўнае чалавецтва шырока адзначалі 50-годдзе ўтварэння Саюза ССР, мы асабліва ясна бачылі велізарныя поспехі ў развіцці шматнацыянальнай савецкай культуры. Прысуджэнне Дзяржаўных прэмій БССР новаму атраду творцаў беларускай літаратуры і мастацтва ўспрымаецца працоўнымі рэспублікі як значная і радасная падзея.

Сярод новых лаўрэатаў Дзяржаўных прэмій БССР і прафесар нашага універсітэта, пісьменнік і літаратуразнаўца Іван Якаўлевіч Навуменка.

Іван Навуменка вядомы чытачам сваімі аповесцямі, апавяданнямі, раманамі, а таксама літаратуразнаўчымі работамі. Поспехі літаратурнай і навуковай дзейнасці Івана Навуменкі адзначаны выбраннем яго членам - к а р э спандэнтам Акадэміі навук БССР. У апошнія гады яго творчасць узбагацілася дзвюма новымі кнігамі: «Янка Купала. Духоўны воблік героя» і «Якуб Колас. Духоўны воблік героя». Кнігі гэтыя, напісаныя ў выніку глыбокага вывучэння спадчыны двух вялікіх паэтаў, склалі новую значную старонку сучаснага беларускага літаратуразнаўства і ўнеслі шмат каштоўнага ў асвятленне праблемы духоўнага вобліку героя ў творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа. За гэтыя работы Івану Навуменку і прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР імя Якуба Коласа.



Бюро ЦК ЛКСМ Беларусі, разгледзеўшы прадстаўленні абкомаў, гаркомаў, райкомаў ЛКСМБ, творчых саюзаў БССР, вучоных і навукова-тэхнічных саветаў навуковых установ, вышэйшых навучальных устаноў, рашэнні журы, пастанавіла прысудзіць прэмію Ленінскага камсамола рэспублікі за 1972 год у галіне навукі Ткачову Валянціну Дзмітрыевічу, доктару фізіка-матэматычных навук, загадчыку кафедры паўправаднікоў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, члену савета маладых вучоных пры ЦК ЛКСМ Беларусі за цыкл работ «Даследаванне радыяцыйных дэфектаў у паўправадніках».

— Работа над тэмай «Радыяцыйныя дэфекты ў паўправадніках» пачалася ў 1960 годзе ў фізічным інстытуце імя П. М. Лебедзева, — расказвае Валянцін Дзмітрыевіч. — Яна дазваляе вывучыць новыя ўласцівасці (электрычныя, аптычныя, фотаэлектрычныя і іншыя) паўправаднікоў. Наколькі плённай з'яўляецца гэтая праца, гаворыць той факт, што толькі выпускнікамі універсітэта абаронена 10 кандыдацкіх дысертацый у гэтым напрамку.

Своеасаблівым прызнаннем работы кафедры з'явілася тое, што І Усесаюзны сімпозіум па радыяцыйных дэфектах у паўправадніках адбыўся ў верасні мінулага года ў нашым універсітэце. Зараз работу працягвае аддзел фізікі і тэхнікі паўправаднікоў у навукова-даследчым інстытуце прыкладных фізічных праблем БДУ.

●

Мы рады павіншаваць нашых лаўрэатаў і пажадаць ім новых творчых поспехаў.

Рэпартаж

«ЦІХА! ЭКЗАМЕН!»

Чаго толькі не гавораць пра студэнцкія экзамены! І цяжка іх бывае здаць, і лёгка. Двоечнік можа атрымаць выдатна, а выдатнік, здараецца, атрымлівае дрэнна. Усё гэта вы ведаеце добра, і размова пойдзе зусім аб іншым. Давайце паглядзім на студэнта ў час экзамена вокам старонняга назіральніка. Разам падумаем, паразважаем.

Да экзамена засталося некалькі хвілін. Здаецца, ужо распытана аб усім у старшакурснікаў, хто-ніхто назапасіў шпаргалак. Толькі ўсё роўна хвалююцца ўсе, бо кожная сесія — нешта новае і непаўторнае. Гэта — гара падручнікаў і канспектаў, бяссонныя ночы (іх многа бывае, што б там ні гаварылі прыхільнікі рэжыму дня), а потым — тая хвіліна, калі ў залікоўцы з'яўляецца добрая адзнака, і ў цябе быццам крылы вырастаюць за спіной.

На дзвярах надпіс: «Цішэй! Экзамен!» У калідоры многалюдна. Хлопцы ходзяць узад і ўперад, дзяўчаты збіліся ў гаманлівую кучку.

У шумным студэнцкім натоўпе няцяжка згубіцца. Тут прымаюць за сваю. Пытаюць аб нечым, штосьці раяць. Цікавы дыялог:

— Шпаргалак многа?

— Не. Толькі адна. Ды і гэта не ведаю, ці спатрэбіцца.

А за дзвярыма з грозным надпісам цішыня. Ледзь-ледзь даносіцца калідорны гул. Сёння прафесар І. І. Гарэлік і яго асістэнт А. У. Баркоў прымаюць у II курса юрфака экзамен па крымінальнаму праву. Адказвае Юра Ігнатаў. Адказвае ўпэўнена, правільна. Вунь як згодна ківае ўвесь час галавой Іосіф Ісакавіч і добра ўсміхаецца Аляксандр Уладзіміравіч. Ну, хай сабе адказвае, а мы ў гэты час паназіраем за іншымі.

У чакальнай позе сядзіць Таня Арцем'ева. Яна ўжо даўно падрыхтавалася і гатова сарвацца з месца якраз у тую хвіліну, як толькі Юра забярэ са стала сваю заліковую кніжку. І Тамара Сідоранка ўжо не піша нічога на сваім лістку, а сядзіць, гледзячы некуды ў адну кропку. Цікава, аб чым яна думае, а можа, проста паўтарае пра сябе параграфы пэўных статутаў?

Цяжка што-небудзь прадбачыць. Здаецца, вельмі ўжо бойка гаварыла аб значэнні савецкага крымінальнага права Таня Арцем'ева. Так што мне, неспецыялісту, часам нават і зразумець было цяжка. Але дапусціла некалькі памылак. І ў выніку — толькі добра. Тамара Сідоранка ледзь паспела зачыніць за сабой дзверы, як прагучала яе звонкае і шчаслівае: «Ура! Пяцёрка!»

Радуюцца ўсе аднолькава, хвалюецца кожны па-свойму. Дзяўчаты не ўмеюць хаваць сваё хваляванне: адна грызе кончык ручкі, другая сядзіць уся чырвоная і чэрціць нейкія фігуркі на лістку, трэцяя нервова папраўляе сваю сукенку. Хлопцы трымаюцца мужна і незалежна. І толькі непрывычная паспешлівасць у рухах і пачырванеўшыя вушы выдаюць іх, як кажуць, «з галавой».

А светлавалосая дзяўчына з кароткай стрыжкай далёка адсунула чысты лісток паперы, ледзь глянула на білет і зараз сядзіць, закінуўшы нагу на нагу. Відаць, аб нечым думае. Такія альбо ведаюць усё, альбо нічога.

Слухаючы адказ Люды Саковіч, так завуць дзяўчыну, я засумнявалася, што крымінальнае права — навука сухая і не вельмі цікавая. Правільная літаратурная мова, уменне разважаць і рабіць вывады, усё, чым так добра валодае Люда, дапамагалі гэтаму. На жаль, экзамен ёсць экзамен. Крыху заблытаўся, і няма аднаго бала. Чацвёрка... І маральнае задавальненне ад таго, што твае веды застаюцца пры табе.

Атрымалі выдатна Люда Галухава, Марына Бурдзівіцкая і яшчэ некалькі чалавек, якія ішлі за імі. Усе, хто састаўляе, так называемы «ўдарны батальён». Такія «батальёны» ёсць у кожнай групе. Яны адказваюць заўсёды першыя, атрымліваюць свае пяцёркі, а потым, у залежнасці ад характару, альбо бягуць перажываць сваё шчасце ў адзіноце, альбо застаюцца і кансультуюць усіх, хто ні папросіць. Люда Саковіч, дарэчы, засталася ля аўдыторыі № 47 аж да самага вечара

Вось ужо і «ўдачкі» пайшлі, нават дзве двойкі ёсць. Экзамен ідзе к канцу.

Дзіўныя людзі гэтыя троечнікі. Усё нечага чакаюць, на нешта спадзяюцца. Цэлы дзень стаяць пад дзвярыма, каб зайсці толькі вечарам, добра-такі патрапаўшы сваю нервовую сістэму. Хаця чаму толькі троечнікі!!

— Антон, ты яшчэ не здаваў?

— Не.

— Ідзі, чаго ты мучышся? Ты ж выдатнік.

А Антон у гэты час сутаргава гартае падручнік, нешта пытае і зноў гартае.

Дзяўчаты ля акна чакаюць сяброўку.

— А ўсё ж добра ён прымае.

— Галоўнае, аб'ектыўна.

— І не вышуквае слабых месц.

Даўно апусцелі калідоры. Толькі сіратліва засталіся ляжаць на падаконніках забытыя падручнікі і канспекты. Іосіф Ісакавіч падводзіць вынікі:

выдатна — 14

добра — 9

здавальняюча — 9.

У цэлым падрыхтоўка нядрэнная. Ну, а тыя, хто падленьваўся, атрымалі па заслугах. Экзамен ёсць экзамен.

Л. ПЕРАСЫПКІНА.

Пяцікурснікі рускага аддзялення філалагічнага факультэта ўважліва слухаюць доктара філалагічных навук С. Х. Александровіча, які праводзіць кансультацыю па курсу літаратуры народаў СССР. Можа менавіта гэтая кансультацыя дапаможа камусьці з іх на экзамене?

Фота Д. Чаховіча.



Ва універсітэцкай чытальнай зале.
Фота **Д. Чаховіча.**

СЕСІЯ НАБРАЛА ТЭМП

Оля Ярута не толькі добра вучыцца, яна—лепшая спартсменка факультэта. Да яе парад варта прыслухацца не толькі першакурснікам.

«Экзамены, экзамены, добрая пара»! У гэты час студэнт можа спаць, колькі яму хочацца, хадзіць у любы час у кіно, але і працаваць яму даводзіцца часта ўдвайне.

У корпусе нашага факультэта цяпер цяжка сустрэць хоць бы групу студэнтаў, калі няма экзамена ці кансультацыі, затое ў чытальнай зале цяжка знайсці свабоднае месца. Чытальныя залы перапоўнены... Сесія. А да яе трэба аднесціся з поўнай сур'ёзнасцю. Тое, што ты ўпусціў у навучальным годзе, што некалі пакінуў на больш позні час, цяпер пара навярстаць, усе веды прывесці ў пэўную сістэму, разлажыць па паліцах і паспяхова здаць экзамены.

Хочацца даць параду нашым першакурснікам. У іх жа гэта першая сесія, самая хвалюючая і адказная. Галоўнае — рэжым дня. Пад'ём усё ж лепш рабіць у адзін і той жа час і не ў 10.00, а ў 7 або ў 7.30. Не трэба сядзець па начах. Рацыянальна выкарыстаны час днём не прымусіць вас адрываць час ад сну. Асабліва гэта адносіцца да апошняй ночы перад экзаменам. Трэба добра выспацца, каб мозг адпачыў. У дзень, калі вы здадзіце экзамен, адпачывайце.

Харчаванне павінна быць трох-, чатырохразовым, паўнацэнным, багатым вітамінамі.

Яшчэ адна парада тым, хто займаецца ў спартыўных секцыях. Не кідайце заняткі. Яны вам дапамогуць захаваць добрае самаадчуванне, лепш рыхтавацца да экзаменаў.

У нас у інтэрнаце № 4 усё зроблена для таго, каб умовы падрыхтоўкі да экзаменаў былі самымі спрыяльнымі. Для заняткаў выдзелены дзве чытальныя залы. Каб не траціць многа часу на прыгатаванне ежы, у буфеце арганізаван продаж гарачых страў, тут можна добра паесці. Нам застаецца падзякаваць рэктарату, нашаму каменданту У. І. Сцяпанаву за тыя ўмовы, якія створаны для студэнтаў у інтэрнаце.

І ў вучэбным корпусе ўсё падпарадкавана сесіі. У любой аўдыторыі можна спакойна займацца. Гэтым карыстаюцца тыя студэнты, якія любяць рыхтавацца да экзаменаў удвух або групамі.

І пачатак сесіі быў паспяховым. Прааналізуем, напрыклад, здачу залікаў на V курсе. Без зрываў прайшлі пяцікурснікі заліковую паласу. Заслугоўваюць пахвалы грунтоўныя і глыбокія веды па спецкурсах студэнтаў Генадзя Вынаева, Ірыны Якаўлевай, Васіля Грачухі, Святланы Бабіч, Марыі Козел і іншых.

Сесія набрала тэмп. Выдатнага фінішу!

О. ЯРУТА,
студэнтка V курса біялагічнага факультэта.

ПАСПЯХОВЫ ПАЧАТАК

— Колькі? Колькі? Які білет выцягнуў?

Не паспелі зачыніцца дзверы, як аднакурснікі абступілі сябра. Пачатак быў добры — выдатная адзнака. Яна падняла настрой усёй III групе III курса факультэта журналістыкі. Экзамен па беларускай літаратуры здалі без троек.

— Наша група заняла другое месца ў конкурсе акадэмічных груп універсітэта, — гаворыць камсорг Валодзя Скульбедаў.— Вядома, аддаваць гэтае месца другім не збіраемся, а расці яшчэ можна.

Гэты экзамен—таксама крок уперад. Сваю ацэнку ведам студэнтаў дае выкладчык Рыгор Міхайлавіч Семашкевіч:

— Трэцяя група пакінула найлепшае ўражанне. Прыемна адзначыць, што многія студэнты імкнуцца ведаць больш, чым патрабуе праграма, цікавяцца сучасным літаратурным жыццём рэспублікі. Гэта Люда Цімчанка, Тамара Скараход, Уладзімір Субат, Уладзімір Скульбедаў.

Група здала экзамен без троек. Гэты яе поспех — будзем спадзявацца — не адзіны ў зімовай сесіі.

І. КУЗНЯЦОЎ,
студэнт.

НАША МЭТА—ДОБРА ВУЧЫЦЦА

У будучых студэнтаў

Больш 170 слухачоў займаюцца на падрыхтоўчым аддзяленні БДУ. Усе яны, вядома, хочуць стаць студэнтамі. А цікава, што абумовіла выбар факультэта?

Зіновій ГАЙДУК, матэматычны факультэт:

— Пасля заканчэння школы паступаў у Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут. Не прайшоў па конкурсу. Да прызыву ў Армію працаваў мулярам на будаўніцтве. Цяга да матэматыкі і школьная мара паступіць у тэхнічную вну і прывялі мяне на падрыхтоўчае аддзяленне. Ёсць і яшчэ адно жаданне: вучыцца на факультэце прыкладной матэматыкі.

Леанід ШЧАРБІН, факультэт журналістыкі:

— У 1968 годзе закончыў двухгадовае тэхнічнае вучылішча, а годам пазней — школу рабочай моладзі. Працаваў на заводзе. Тады, можна сказаць, і зрабіў першыя крокі ў журналістыку, пачаў пісаць у раённую газету, сваю заводскую.

З Арміі прыйшоў у маі мінулага года, спрабаваў паступіць на факультэт журналістыкі. Сам падрыхтавацца добра не змог, атрымаў тройкі і не прайшоў па конкурсу. Цяжка сказаць, што абумовіла выбар гэтага факультэта, але адзін з фактараў — гэта любоў да мастацкага слова.

Уладзімір САС, біялагічны факультэт:

— У школе захапляўся біялогіяй. Але для ажыццяўлення школьнай мары — паступіць на біяфак універсітэта — і ў мяне таксама не хапіла бала. І нават працуючы слесарам, лічыў біялогію самай цікавай навукай. Ну, а з прафесій мне падабаецца прафесія настаўніка.

— Раскажыце пра свае першыя ўражанні аб вучобе, і некалькі слоў аб тым, як вы ўяўляеце сваю будучую прафесію.

З. ГАЙДУК:

— Прынялі мяне добра. Жыву ў новым інтэрнаце на Кастрычніцкай вуліцы. Застаецца адно— выдатна вучыцца.

У цэлым нейкае ўяўленне ад будучай прафесіі ёсць. А больш пазнаёміцца з ёй, мне здаецца, нам яшчэ дапамогуць студэнты матэматычнага факультэта. Хоць, праўда, аб такіх сустрэчах мы яшчэ толькі марым. Але хочацца верыць, што знойдуць старшакурснікі час заглянуць і да нас, расказаць аб традыцыях факультэта, асаблівасцях вучобы.

Л. ШЧАРБІН:

— Вучоба на падрыхтоўчым аддзяленні — мой першы крок да ажыццяўлення мары — стаць падрыхтаваным журналістам. Шлях да гэтага адзін — веды.

Прафесія журналіста для мяне самая патрэбная і самая лепшая.

У. САС:

— Вучоба цяжкая, як і ўсякая праца. Цікавая, як любімая справа.

З працай настаўніка, вядома, знаёмы... Думаю, цікавыя сустрэчы са студэнтамі біяфака ў нас наперадзе. Добра б ведаць, як яны плануюць свой працоўны дзень, выкарыстоўваюць вольны час?

І. КАВАЛЬЧУК,
студэнт журфака.

Чым закончыцца гэтая сустрэча экзаменатара са студэнтам? Яшчэ адно, апошняе пытанне задае студэнту III курса А. Казакевічу выкладчык кафедры крымінальнага працэсу А. Т. Арэшка. Фота **Д. Чаховіча.**

ШТО ТАКОЕ ПЕДАТРАД

Галоўным пытаннем чарговага пасяджэння камітэта камсамола універсітэта была работа педатрадаў у домакіраўніцтвах горада. Валодзя Галубовіч, кіраўнік шэфскага сектара, расказаў аб тым, што ўжо зроблена.

На падставе рашэння ГК ЛКСМБ ва універсітэце створаны педагагічныя атрады, да 30 чалавек у кожным, для работы ў домакіраўніцтвах №№ 1, 2, 3, 4, 5, 6 Цэнтральнага раёна і іншых. Студэнты арганізуюць пры домакіраўніцтвах розныя гурткі, працуюць з падлеткамі, якія значацца ў спісе дзіцячага пакоя міліцыі.

Асабліва добра працаваў педатрад гістарычнага факультэта на вуліцы Фабрыцыуса. Студэнты поўнасцю абсталявалі і афармілі дзіцячы пакой, фоталабараторыю і піянерскі пакой па вуліцы Камсамольскай.

Дык што ж такое педатрад, якую ролю адыгрывае ён у жыцці дзяўчынак і хлопчыкаў нашага горада? Аб гэтым добра сказала Клаўдзія Іванаўна Папова, член партбюро домакіраўніцтва № 1, якую запрасілі на пасяджэнне камітэта камсамола.

— Работа з падлеткамі— *(Працяг на 3-й стар.).*

ПАНЯДЗЕЛАК — ДЗЕНЬ ЦЯЖКІ

Панядзелак, 15 студзеня. Калідоры геаграфічнага факультэта. Натоўпы ля дзвярэй. Знаёмыя «экзаменацыйныя» выразы твараў: «Ну, як?» Сесія...

Варта трапіць у гэты наэлектрызаваны натоўп, як сам пачынаеш хвалявацца.

Першакурснікаў пазнаеш адразу. Яны хвалююцца без аглядак на саліднасць, як зусім нядаўна хваляваліся на выпускных і ўступных. У іх няма «ветэранаўскага» спакою чакання і стрыманасці старшакурснікаў. І, здаўшы, радуюцца так, як можа радавацца толькі першакурснік, атрымаўшы сваю першую адзнаку ў сценах вну.

Ля дзвярэй 21-й аўдыторыі шапацяць старонкі падручніка па гісторыі КПСС.

— Страшна?

— Кажуць, Надзежда Паўлаўна добра прымае.

Каму не вядома ўсемагутнасць гэтага «кажуць» у дні сесіі! «Кажуць, спісаць можна...». «Кажуць, двойкі ставіць, дапытвае па паўгадзіны кожнага». І адпаведна гэтым «кажуць» ці крыху падымаецца, ці, наадварот, падае настрой першакурсніка.

Дзверы выпускаюць чарговага шчасліўца. Чатыры балы. Потым яшчэ аднаго. Пяцёрак нешта даўно не было. Прагледзеўшы апошні раз канспект і пагартаўшы падручнік, заходзіць у аўдыторыю чарговы студэнт. Трэцяя група першага курса працягвае здаваць.

А ў гэты час паверхам вышэй ля дзвярэй 45-й аўдыторыі гавораць аб кембрыйскім перыядзе, берагавой эрозіі, геасінкліналі. Чацвёртая група хвалюецца крыху больш. Прадмет не з лёгкіх, да таго ж аб Дзмітрыю Міхайлавічу Каруліну «кажуць», што ён строгі экзаменатар. Вунь якое ажыўленне сярод студэнтаў, калі на яго месца за экзаменатарскі стол села Рэгіна Усеваладаўна Гілевіч. «Заходзьце хутчэй, пакуль там Рэгіна Усеваладаўна, потым горш будзе...» — раяць старонняя, балельшчыкі.

А за дзвярыма з табліч кай «Кабінет геалогіі» ўсё не так страшна, як здаецца.

Дзмітрый Міхайлавіч з той катэгорыі экзаменатараў, па тварах якіх студэнту нельга меркаваць аб сваім лёсе. Часам можа здацца, што ён амаль не слухае адказ. Але варта недзе заблытацца, нават не так вымавіць тэрмін, і ён робіць заўвагу. Прыемна было слухаць адказ Л. Собалевай, прыемна ставіць ёй выдатную адзнаку. А вось адказ М. Барысенкі зусім слабы. Наводзячыя пытанні не выратоўваюць. Відаць, што Дзмітрыю Міхайлавічу не хочацца ставіць нездавальняючую адзнаку. Дапускаючы, што гэтая тэма не запомнілася студэнту, задае пытанні па другой. Але вынік такі ж. Непрывычна спакойна і будзённа гучыць страшная фраза: «Сустрэнемся ў другі раз».

Тым часам у аўдыторыі № 21 Надзежда Паўлаўна Хрыпко закрывае апошнюю заліковую кніжку. Цікава, якое ў яе ўражанне ад экзамена?

— Увогуле — група сярэдняй паспяховасці. Яна і на семінарскіх занятках асабліва не вылучалася. Але гэта нічога, што толькі адна выдатная адзнака. Чацвёркі у студэнтаў на сённяшнім экзамене моцныя.

Вось што змясціла ў сабе сёння экзаменацыйная ведамасць: 1 выдатная адзнака, 17—добрых, 6 — здавальняючых, 2 — нездавальняючыя. Зразумела, што гэты вынік асабліва радаваць не можа.

— Першы ж курс. Ім цяжка адвыкнуць ад школьных прыёмаў адказаў і падрыхтоўкі. Тут большы аб'ём матэрыялу, больш трэба працаваць самастойна. Тое, што гісторыя КПСС не спецыяльны для факультэта прадмет, — не апраўданне. Тыя, хто атрымаў дрэнную адзнаку па гісторыі КПСС, не зусім паспяхова здаюць спецыяльныя прадметы. І наадварот.

Сапраўды, напэўна ж не выпадкова ў залікоўцы А. Кашынскага ўжо дзве пяцёркі. С. Краўцова, Т. Кратовіч і А. Кондрат аднолькава добра здалі і агульнае землязнаўства і гісторыю КПСС.

Надзежда Паўлаўна не першы год прымае экзамен у першакурснікаў. Па вопыту ведае, што такія адзнакі — «гэта не страшна».

— На другім курсе вынікі заўсёды лепшыя. Першакурснікі прывыкнуць да патрабаванняў вну, ім будзе лягчэй разбірацца ў складаных пытаннях.

А якія вынікі «цяжкага панядзелка» ў IV групы? «Выдатна»—1, «добра»—10, «здавальняюча» — 15, «нездавальняюча» — 1.

Дзмітрый Міхайлавіч не вельмі задаволен групай. Але ў яго таксама вялікі вопыт, і ён упэўнен, што ўвогуле справы нядрэнныя.

— Геалогія — зусім новы прадмет для ўчарашніх дзесяцікласнікаў. У школе ім выкладаюць матэматыку, геаметрыю, літаратуру, геаграфію. Аб геалогіі ж яны даведваюцца толькі ў вну і пачынаюць вывучаць яе без усялякай папярэдняй базы. Вы чулі адказы? Колькі тэрмінаў трэба вывучыць! Адно вымаўленне іх патрабуе навучання. А трэба ж і разабрацца. Многа даюць практычныя заняткі. Студэнты дзякуючы ім свабодна працуюць з геалагічнай картай, вызначаюць мінералы. Тэорыя даецца цяжэй...

Вось і закончыўся «цяжкі панядзелак» І курса геафака.

Т. ЗАСІМ.

У НОВЫХ ПОШУКАХ

У жніўні 1948 года семнаццацігадовы юнак прыехаў упершыню ў жыцці ў Мінск здаваць уступныя экзамены на філфак БДУ. Яму пашанцавала — мара збылася. «У пінжаку трафейнага паходжання, які рабіў мяне неймаверна плячыстым, — успамінае сёння Алег Антонавіч Лойка, — паехаў я ў студэнты. І аж пяць гадоў насіў я з бацькавага пляча жоўтую, аж да рыжа-бурага выцвілую потым тужурку».

Аднак хіба ўся справа ў адзенні! Ён вучыцца ва універсітэце, а гэта самае галоўнае! Літаратурнае жыццё адразу захапіла Алега Лойку, і ўжо амаль ні адзін літаратурны вечар ці дыспут не праходзіў без удзелу гэтага энергічнага, вясёлага і разам з тым удумлівага юнака.

Вядома, кожны студэнт мае свайго лепшага сябра, ён і яго сябры Р. Грышкевіч, Я. Пархута, І. Крэнь, В. Дзмітрэнка выступаюць з вершамі. Для другога нумара альманаха (1951) А. Лойка рыхтуе артыкул «Янка Купала і Максім Горкі».

У студэнцкія гады Алег Лойка спрабуе пісаць вершы. Часам заходзіць у рэдакцыі. І хоць не друкаваўся—непрыкметна набіраўся вопыту, дзякуючы перш за ўсё шчырым, клапатлівым адносінам М. Аўрамчыка, С. Дзяргая. Студэнцкія гады, інтэрнат упершыню прымусілі сур'ёзна задумацца над жыццём, над стаўленнем да чалавека, да часу», — успамінае Алег Антонавіч.

Сваім дэбютам, хоць гэта была не першая публікацыя, А. Лойка лічыць вершы, надрукаваныя ў снежні 1953 года ў «Маладосці». Але пачаткам больш сістэматычнай работы стаў для яго 1957 год, калі «Маладосць» упершыню прадставіла яго чытачам нізкай вершаў.

Прастата ў абыходжанні, шчырасць дапамаглі студэнту Алегу Лойку лёгка сысці з новымі сябрамі, незалежна ад іх узросту. Хутка на філфак прыйшлі Н. Гілевіч, А. Вярцінскі, М. Арочка, Р. Барадулін, Г. Бураўкін і іншыя. Літаратурныя вечары з іх удзелам сталі яшчэ больш яркімі і запамінальнымі. Так праходзілі студэнцкія гады. Прыйшла і пара пакінуць сцены факультэта. Аднак лёс Алега Лойкі склаўся так, што ён не разлучаецца з родным універсітэтам. Як студэнта-выдатніка яго пакінулі ў аспірантуры пры кафедры беларускай літаратуры. У маі 1956 года Алег Лойка абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Адам Міцкевіч і беларуская літаратура». У сваёй працы А. Лойка імкнуўся як мага шырэй ахапіць узаемаадносіны А. Міцкевіча з Беларуссю, яе прыродай, народам, літаратурай, фальклорам, этнаграфіяй, побытам і інш. Гэтае даследаванне — значны ўклад у вывучэнне спадчыны вялікага паэта.

З 1 жніўня 1956 года Алег Лойка працуе ва універсітэце. У 1959 годзе выходзіць яго першы зборнік вершаў «На юначым шляху», у 1961 г.—новы зборнік «Задуменныя пералескі». Алег Лойка па-свойму імкнецца расказаць пра ўсё, што хвалюе яго. Ён любіць, разумее і добра адчувае родную прыроду. «Лясная песня» — невялічкая паэма — сапраўды песня жыццю нашых продкаў і сучаснікаў, погляд у заўтрашні дзень народа. Гэта сведчанне таленту, сталага майстэрства паэта, патрабавальнасці да сябе. Алег Антонавіч гаворыць: «Праца ва універсітэце мяне сапраўды вучыла і вучыць. Яна не дае заспакоіцца, прымушае думаць, шукаць новых спосабаў і прыёмаў падачы матэрыялу, эксперыментаваць».

Паэт не спыняецца на дасягнутым, ён у новых пошуках. Улюбёнасць у жыццё, захапленне красой роднай зямлі гучаць у радках новага, трэцяга па ліку зборніка вершаў — «Дарогі і летуценні» (1963). Аўтар раскрывае багаты ўнутраны свет нашага сучасніка, стварае вобраз чалавека з маштабамі на руках, чалавека-будаўніка.

Каштоўным укладам у распрацоўку гісторыі беларускай літаратуры з'яўляецца манаграфія А. Лойкі «Максім Багдановіч» (1966). Любоў і захапленне творчасцю М. Багдановіча спалучаны ў ёй з усебаковым і тонкім аналізам паэтычнага майстэрства класіка беларускай літаратуры. У сваёй кнізе А. Лойка сказаў новае слова пра М. Багдановіча.

У 1965 годзе выходзіць чацвёртая паэтычная кніга «Блакітнае азерца». Зборнік адкрываецца нізкай вершаў, народжаных паездкамі паэта на Поўдзень. На першым плане чалавек, яго стваральная праца.

Праз год выходзіць кніга паэта для дзяцей — «Карагод дзівосных прыгод». Алег Лойка ўмее прыкмеціць цікавыя з'явы, прыдумвае забаўныя сюжэты і знаходзіць даступныя дзіцячаму разуменню вобразы. Паэту ўдалося перадаць свежасць дзіцячых успрыманняў. Усё, з чым сутыкаюцца героі кніжкі, становіцца «дзівосным» і па-новаму цікавым.

Для чалавека заўсёды ёсць патрэба ў споведзі перад часам і самім сабой. Мінулае і сённяшняе — гэта межавыя слупы таго абсягу, на якім Алег Лойка працоўвае сваё поле. У зборніку «Каб не плакалі кані» паэт стараецца перадаць аблічча маладога сучасніка, які шчасліва спалучае ў сабе чысціню юнацкіх пачуццяў з сур'ёзнай паэтычнай культурай. Новы зборнік «Дзівасіл», які выйшаў у свет у 1969 годзе, прасякнут матывамі любві да Радзімы, да народа. Аўтар апявае працу, якой «трэба ўсім сэрцам аддацца, нібыта каханай—да дна», працу, якая «святкуе ў душы».

Нядаўна Алегу Антонавічу споўнілася сорак гадоў. К юбілею паэта выйшлі яго выбраныя вершы «Калі ў дарозе ты...». Тут аўтар выступае як паэт рамантычна-узнёслага плана.

У 1969 годзе А. А. Лойка абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «М. Багдановіч і праблемы развіцця беларускай паэзіі пачатку XX ст.». З 1971 года ён прафесар кафедры беларускай літаратуры нашага універсітэта. Усе свае сілы і здольнасці аддае Алег Антонавіч выхаванню маладога пакалення, спецыялістаў высокай кваліфікацыі. З 1964 года і па сённяшні дзень А. А. Лойка кіруе універсітэцкім літаратурным аб'яднаннем «Узлёт». У поспехах маладых універсітэцкіх літаратараў ёсць значная доля яго працы, яго намаганняў. За ўсё гэта студэнты шчыра ўдзячныя свайму настаўніку і дарадчыку Алегу Антонавічу Лойку.

Н. СУПРУН,
В. САЛАЎЁВА,
члены гуртка гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры.



Экзамен па асновах навуковага атэізму здаюць студэнты III курса філфака беларускага аддзялення. Адказ Святланы Сяховіч слухае кандыдат філасофскіх навук А. А. Круглоў.

Фота **Д. Чаховіча.**

ЦІКАВА ВЕДАЦЬ

УСЁ, ШТО ВЫДАДЗЕНА, ЗАХОЎВАЕЦЦА ВЕЧНА

Калі чытача зацікавіла якая-небудзь з 75 тысяч названых кніг і брашур, якія выпускаюцца штогод у Савецкім Саюзе больш 200 кніжнымі выдавецтвамі, ён можа атрымаць звесткі аб іх у друкаванай картачцы. Гэтыя картачкі ёсць ва ўсіх бібліятэках краіны універсальнага профілю, галіновых і масавых бібліятэках, навуковых і інфармацыйных установах, навучальных установах. А рыхтуе і выпускае іх Усесаюзная кніжная палата.

Чытач, які жадае, напрыклад, пазнаёміцца з літаратурай, прысвечанай Сібіры, таксама можа звярнуцца ў Кніжную палату і атрымаць там вычарпальны адказ. Гэтая ўстанова дае інфармацыю па любому бібліяграфічнаму пытанню, няхай гэта гісторыя выдання асобнай газеты, часопіса, кнігі, творы пісьменніка ці працы вучонага.

●

Усесаюзная кніжная палата ў Маскве... Гэта як бы лоцман, які дазваляе беспамылкова арыентавацца ў бязмежным моры кніжнай прадукцыі, выпускаемай у краіне. Усесаюзная кніжная палата — цэнтр дзяржаўнай бібліяграфіі і статыстыкі савецкага друку. Яна здзяйсняе навукова-метадычнае кіраўніцтва ўсімі бібліяграфічнымі ўстановамі СССР, а таксама кніжнымі палатамі, якія ёсць у кожнай саюзнай рэспубліцы.

Усесаюзная кніжная палата інфармуе аб выходзячых у краіне кнігах і брашурах (у штотыднёвіку і штомесячніку «Кніжны летапіс», у штогодніку «Кнігі ў СССР»), аб творах музычнага і выяўленчага мастацтва («Нотны летапіс» і «Летапіс друкаваных твораў выяўленчага мастацтва»), аб картах, атласах і схемах (у штогадова выпускаемым «Картаграфічным летапісе»), аб газетах, часопісах, бюлетэнях («Летапісы перыядычных выданняў») і г. д.

Акрамя інфармацыі аб асобна выпушчаных творах друку, Кніжная палата дае чытачу звесткі аб найбольш важных артыкулах з часопісаў і зборнікаў, з цэнтральных і рэспубліканскіх газет (у «Летапісе часопісных артыкулаў» і «Летапісе газетных артыкулаў»), а таксама аб апублікаваных у савецкім перыядычным друку рэцэнзіях на савецкія і зарубежныя выданні (у «Летапісе рэцэнзій»). Акрамя бягучай бібліяграфічнай інфармацыі аб выданнях, яна робіць улік бібліяграфічных матэрыялаў, апублікаваных у Савецкім Саюзе (штогоднік «Бібліяграфія савецкай бібліяграфіі»).

Кніжная палата займаецца дзяржаўнай статыстыкай савецкага друку. Улічваюцца выданні, якія маюць грамадскае, навуковае, практычнае і інфармацыйнае значэнне. Вынікі гэтага ўліку ўключаюцца ў штогоднік «Друк СССР» і прадастаўляюцца ў ЮНЕСКА для публікацыі.

Усесаюзная кніжная палата атрымлівае бясплатны кантрольны экземпляр усіх твораў савецкага шматнацыянальнага друку, якія выходзяць у краіне. Гэтыя экземпляры кніг, перыёдыкі, нот, афіш, плакатаў і г д., пачынаючы з 1917 года па цяперашні час, захоўваюцца вечна ў Архіве савецкага друку, агульны фонд якога перавышае цяпер 35 мільёнаў друкаваных адзінак. Кантрольны экземпляр выкарыстоўваецца не толькі для дзяржаўнай рэгістрацыі і бібліяграфічнай інфармацыі, але і для камплектавання айчыннымі выданнямі фондаў буйнейшых бібліятэк краіны.

Вялікую работу вядзе Кніжная палата і ў галіне развіцця і ўдасканалення тэорыі і методыкі бібліяграфіі. Як цэнтральная бібліяграфічная ўстанова краіны яна выдае тэарэтычны орган савецкіх бібліёграфаў — зборнік «Савецкая бібліяграфія».

У заключэнне застаецца дабавіць, што дзейнасць Усесаюзнай кніжнай палаты не абмяжоўваецца Савецкім Саюзам. Палата падтрымлівае ажыўленыя сувязі з бібліяграфічнымі цэнтрамі сацыялістычных краін, удзельнічае ў рабоце міжнародных форумаў бібліёграфаў і бібліятэчных работнікаў.

Эльза МАЙО-ЗНАК,
намеснік дырэктара Усесаюзнай кніжнай палаты.

ШТО ТАКОЕ ПЕДАТРАД

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.).

справа важная і нялёгкая. Ад таго, як яна пастаўлена; залежыць правільнае выхаванне дзяцей, развіццё ў іх высокіх грамадзянскіх якасцей, культуры паводзін.

Іменна выхаваннем падлеткаў і займаюцца педатрады БДУ, якія аб'ядноўваюць больш за 400 студэнтаў з розных факультэтаў.

Амаль кожны дзень спяшаецца ў бібліятэку домакіраўніцтва № 1 Таня Бондарава. Там ужо чакаюць яе юныя кнігалюбы. І кожнаму трэба даць кніжку па густу, нешта растлумачыць.

Алег Сафонаў і Лёня Стаброўскі з фізфака арганізавалі фотагурток. Тут усё вядзецца салідна: спачатку тэорыя, а потым — практыка. На зімовыя канікулы школьнікі таксама атрымалі заданне.

«Наш Лёша». Так называюць хлопчыкі, што жывуць на вуліцах гэтага ж домакіраўніцтва № 1, свайго спартарганізатара А. Пагрэбнікова. Гэта нічога, што зіма ў гэтым годзе бясснежная. Ёсць жа штучны каток, а то можна ўсёй ватагай ісці ў сквер і праводзіць спартыўныя гульні. Зараз у Лёшы, як і ў іншых,—сесія. Часу не хапае. Таму сумуюць яго хлопцы. «Хутчэй бы Лёша прыйшоў»,— просяць.

Добрую, цікавую справу робяць члены педатрадаў. Але часам здараецца, што не хапае вопыту, асабліва на малодшых курсах, ці шчырае жаданне працаваць сутыкаецца з халоднай абыякавасцю кіраўнікоў пэўных арганізацый. Так здарылася, напрыклад, у Заводскім раёне. Значыць, аднаго энтузіязму мала. Трэба і вучобу атрадаў наладзіць, і весці растлумачальную работу перш за ўсё з дарослымі. Ды і на факультэтах няблага было б шырэй асвятляць работу педатрадаў, прыцягваць у іх новыя сілы, паставіць справу так, каб прыходзілі ў атрад людзі, адданыя справе выхавання дзяцей.

Л. ДРУЗЕВА.
(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).



С утра подъем, с утра
И до вершины — бой.
Одержишь ты в горах
Победу над собой!

Фота Т. ЗАСІМ.

У НАШЫМ КЛУБЕ

Сёлета клубу турыстаў-альпіністаў універсітэта спаўняецца 15 год. З 1958 года ён з'яўляецца родным домам для тых, хто любіць дарогі, хто жадае ўбачыць самыя прыгожыя куткі нашай Радзімы, хто хоча пазнаць цану сабе, зразумець, што такое дружба.

Студэнцкія гады... Першыя паходы... Тысячы кіламетраў пройдуць пасля людзі, у іх будуць тысячы сустрэч, але назаўсёды запомняць яны свой першы паход, сваіх сяброў, кастры і песні. І назаўсёды застануцца ў іх, як каштоўны падарунак, ласкавая прыгажосць Беларусі, суровая веліч гор, ціхае змярканне Карэліі, снежны сон Урала, густая сінь Хібін, а галоўнае — людзі, якіх яны сустракалі, іх цеплыня і дружба.

У статуце клуба запісана: «Членам клуба турыстаў-альпіністаў БДУ можа быць любы студэнт і супрацоўнік універсітэта, які паспяхова спраўляецца з вучэбна-вытворчай работай». А ў жартоўным пашпарце клуба, напісаным з выпадку яго 10-годдзя, указваецца: «Рэзерв клуба—1400 студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта!».

Зрабіць турызм самым папулярным відам адпачынку і самым масавым відам спорту — праграма нашага клуба, і яна паспяхова здзяйсняецца. Калі ў 1959 годзе быў праведзен толькі адзін лыжны паход па Беларусі, у якім удзельнічала ўсяго 6 чалавек, то ўжо ў 1961 годзе ў першым агітацыйна-масавым паходзе, прысвечаным 40-годдзю універсітэта, удзельнічала ўжо 13 груп. Роўна праз 10 год у зорным паходзе, прысвечаным 50-годдзю БДУ, прынялі ўдзел 80 студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта.

З кожным годам пашыраецца і дыяпазон нашых падарожжаў. Калі зімой 1961 года быў праведзен адзін паход высокай катэгорыі складанасці па Кольскаму паўвостраву), то ў 1972 годзе — 4 такія паходы (па Кольскаму паўвостраву, Уралу, Карпатах).

Аднак трэба адзначыць, што турклуб, які цяпер налічвае звыш 250 чалавек, не мае фактычна свайго памяшкання і мае ўсяго 40 камплектаў турысцкай амуніцыі (рукзакоў і спальных мяшкоў), якія даўно ўжо прыйшлі ў непрыгоднасць.

Праграма мерапрыемстваў, намечаных турклубам на 1973 год, даволі шырокая. Мы рыхтуем агітацыйна-масавы паход, прысвечаны 50-годдзю ўтварэння СССР. Групы пойдуць на Паўднёвы Урал, на Валдайскае ўзвышша, вясной намячаем правесці зборы альпвістаў на Каўказе і, вядома, паходы ў час летніх канікул.

Так, турызм — цудоўны адпачынак, загартоўка арганізма, забеспячэнне ўсебаковага фізічнага развіцця чалавека. Цяпер, бадай, наўрад ці сустрэнеш чалавека, які, схадзіўшы аднойчы ў паход, не стаў бы пасля заўзятым турыстам.

Сябры, прыходзьце ў наш клуб!

А. ЗАЛАН,
старшыня клуба турыстаў-альпіністаў БДУ.

І БЫЛО ЛЕТА...

ТРЭЦІ дзень у гарах непагадзь. Трэці дзень мы сядзім у палатках, хутаемся у пухоўкі і час ад часу выглядаем на двор.

Мы клянём пра сябе і гэтую цясніну, названую чамусьці Цёплым кутком, і гэты «чортаў» Архімед, вяршыню, на якую мы так і не можам узысці з-за непагадзі.

Прайшло ўжо каля двух тыдняў, як мы, пяцёра універсітэцкіх альпіністаў, знаходзімся тут, у гарах Кабардзіна-Балкарыі, у альпінісцкім лагеры «Безенгі». Ззаду—лёдава-снежныя і скальныя заняткі. Ужо зроблена трэніровачнае ўзыходжанне на вяршыню Гідан-тау. Наперадзе самыя цікавыя і самыя цяжкія ўзыходжанні. Першае — на Архімед. І трэба ж — такі пачатак. Заўтра заканчваецца кантрольны тэрмін. На зыходзе бензін і прадукты. Але мы ўсё-такі спадзяёмся.

Раніцай выходзім са світаннем. Надвор'е асабліва не палепшылася, але чакаць больш нельга. Ісці нялёгка. На апрацоўку снежнага схілу, які на занятках мы пераадольвалі мінут за сорак, цяпер трацім амаль каля дзвюх гадзін: столькі снегу выпала за гэтыя тры дні. Інструктары В. Цалавахін і В. Альшанскі адкрываюць маленькую «нараду». Старэйшына нашага аддзялення Коля Яўменчыкаў накіроўваецца да іх. Праз некалькі мінут ён вяртаецца, і мы даведваемся аб рашэнні кіраўнікоў: «Спускаемся ўніз». Што ж, ад альпініста патрабуецца мужнасць і смеласць не толькі для таго, каб пакараць вяршыні, але і каб адступіць, калі гэта неабходна.

Прайшло некалькі дзён. Мы правялі разбор папярэдняга выхаду. Падрыхтаваліся да наступнага. Вечарамі ў нашым пакоі збіраліся рабяты з Масквы, Ленінграда, Адэсы. За дзвярыма шыпеў прымус, на якім рыхтаваўся чай, а мы спрачаліся, гаварылі пра горы, пра вучобу, але часцей проста спявалі. У адзін з такіх вечароў у пакой уляцеў Сір (ён жа Воўка Сіроцін) і выпаліў: «Ідзём на «Аўстрыйкі»! На сем дзён!».

«Аўстрыйкі» (Аўстрыйскія начоўкі) знаходзяцца на берагавой марэне Безенгійскага ледніка, на вышыні 3200 метраў. А насупраць, пакрыты лёдам і снегам, цуд прыроды — Безенгійская сцяна. Сцяна, аб якой ходзяць легенды, спяваюцца песні. Шхара, Джангі-тау, Катын-тау, Гестала — гэтыя вяршыні ў масіве сцяны здаўна прыцягвалі да сябе смельчакоў. Гэта сапраўдныя горы. Прыгожыя і суровыя, парою непрыступныя. Часам са сцяны, з вышыні амаль двух кіламетраў, прагрукоча ўніз лавіна. Затым зноў наступае цішыня. Толькі часам крык улара (горнай курапаткі) або камень, кануты турам, патрывожаць гэтае ледзяное маўчанне.

Ішлі дні. Мы зрабілі два ўзыходжанні — на Башха-ауз-башы і траверс дзвюх вяршынь — Варшава—Села.

16 ліпеня дзесяць чалавек, сярод якіх былі і мы, накіраваліся на ляднік Ніжні Цаннер, да правай часткі Безенгійскай сцяны, дзе, як бы яе замыкаючы, узвышалася Гестала. Нас чакала ўзыходжанне, аб якім марылі ўсю змену, самае цяжкае з усіх папярэдніх і самае захапляючае.

17 ліпеня. Выходзім ноччу. Калі падняліся на перавал Ніжні Цаннер, ужо світала. Першыя праменні сонца пачырванілі снежныя грабяні вяршынь. На фоне блакітна-зялёнага неба яны надзвычай прыгожыя. Але доўга любавацца не прыходзіцца. Наперадзе цяжкая і доўгая работа. Спачатку пераадольваем лёдава-снежны схіл, які вядзе на вяршыню Ляльвер, што стаіць на нашым шляху. Спусціўшыся з Ляльвера, на снежным плато ставім палаткі. Тут нам давядзецца начаваць. Дзве звязкі ідуць уперад біць прыступкі. Хутка астатнія даганяюць іх. Ніякіх прыкмет, што надвор'е будзе псавацца. Наадварот, ноч абяцае быць ціхай і ясной. Але ўжо на світанні нас разбудзіў вецер. Ён выў, як звер, і ўсё мацнеў. Ён ірваў палаткі, і мы, не разлучаючыся, трымалі іх, каб не паляцелі ў бездань. Ён ірваў і кідаў нам у твар снег, і мы, не разлучаючыся, ішлі ўверх, ішлі, каб не замерзнуць, каб не ператварыцца ў ледзяныя статуі.

Ішлі, пакуль не ўбачылі, што ўжо ідзём па вяршыні.